Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 11 (356) | Субота, 14 сакавіка 1959 года | Цана 20 кап.

У НАС НА ХІМФАКУ

На хімфаку працуе каля 50 чалавек навуковых работнікаў. У цесным кантакце з аспірантамі, студэнтамі V курса, якія працуюць над эксперыментальнымі дыпломнымі работамі, а таксама з некаторымі студэнтамі малодшых курсаў супрацоўнікі факультэта актыўна займаюцца навукова-даследчай работай.

У плане навукова-даследчай работы на 1959 год, які нядаўна разглядаўся Вучоным саветам хімічнага факультэта, прадстаўлены раздзелы хіміі ў адпаведнасці з рознабаковымі інтарэсамі кафедраў факультэта.

Многа ўвагі ў 1959 годзе будзе ўдзяляцца хіміі высокапалімераў.

Гэты раздел хіміі распрацоўваўся вучонымі і ў мінулыя гады. Але пасля майскага Пленума ЦК КПСС, рашэнні якога прадугледжваюць развіццё самым шырокім фронтам даследаванняў у галіне высокапалімераў, усе кафедры факультэта перагледзелі сваю работу і значна ўзмацнілі ўвагу да гэтай важнай у народнагаспадарчых адносінах галіны хіміі.

У гэтым годзе на кафедры фізічнай хіміі пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН БССР М. М. Паўлючэнкі будзе працягнута вывучэнне акіслення цэлюлозы—важнай сыравіны для многіх галін прамысловасці.

На кафедры аналітычнай хіміі пад кіраўніцтвам прафесара Г. Л. Старобінца працягваецца даследаванне механізма іённага абмену па высокапалімерах—новага, вельмі важнага метаду ачысткі і раздзялення многіх рэчываў.

Для атрымання высокапалімераў з новымі ўласцівасцямі неабходна выкарыстанне новых паскаральнікаў палімерызацыі—так званых «ініцыятараў», а таксама зыходных для палімерызацыі рэчываў-монамераў. Пошукі новых «ініцыятараў» і монамераў узначальвае на кафедры каталізу акадэмік АН БССР Б. В. Ярафееў. Рэакцыі палімерызацыі будуць вывучацца на кафедры арганічнай хіміі пад кіраўніцтвам прафесара Т. Г. Асіпенкі і доктара хімічных навук Ю. А. Адэлькопа, уласцівасці высокапалімераў—на кафедры неарганічнай хіміі пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР М. Ф. Ярмоленкі.

Даследаванні ў галіне высокапалімераў яшчэ больш пашырацца ў наступныя гады. Вучоны савет хімічнага факультэта зацвердзіў перспектыўны план даследаванняў у гэтай галіне хіміі на 1959—1965 гады. Такое планаванне даследчай работы загадзя на працяглы перыяд вельмі дапамагае ўзгадняць даследчую работу розных навуковых устаноў і ВНУ і шырокім фронтам разгарнуць даследаванне найбольш вузлавых праблем навукі.

Акрамя развіцця тых работ, якімі будуць заняты супрацоўнікі і студэнты хімічнага факультэта ў 1959 годзе, у перспектыўным плане прадугледжана вывучэнне будовы і ўласцівасцяў бялковых рэчываў, якое будзе ўзначальвацца акадэмікам АН БССР М. Ф. Ярмоленкам.

Пашырэнню даследаванняў у галіне высокапалімераў будзе садзейнічаць адкрыццё навукова-даследчай лабараторыі хіміі і фізікі высокапалімераў, якая павінна быць арганізавана ў бліжэйшым будучым.

У плане навукова-даследчай работы хімічнага факультэта на 1959 год прадугледжана развіццё і працяг многіх іншых цікавых і важных даследаванняў. Дацэнты І. Г. Цішчанка, В. Ф. Бяляеў і К. А. Пячэрская будуць заняты пошукамі атрымання новых складаных арганічных рэчываў, пад кіраўніцтвам акадэміка М. Ф. Ярмоленкі будуць вывучаны адсарбцыйныя ўласцівасці розных вугаляў, пад кіраўніцтвам прафесараў М. М. Паўлючэнкі і Б. В. Ярафеева будуць вывучацца рэакцыі цвёрдых рэчываў. Асабліва многа ўвагі апошняму пытанню ўдзяляецца ў лабараторыі радыёхіміі, арганізаванай на факультэце ў 1957 годзе і ўзначальваемай М. М. Паўлючэнкам. Для больш глыбокага вывучэння важных у практычных адносінах рэакцый серанасычэння металаў і іншых рэакцый тут у даследаваннях прымяняюцца радыёактыўныя ізатопы. Лабараторыя наладзіла сувязь з аўтамабільным заводам і ў 1959 годзе сумеснымі намаганнямі дзвюх устаноў будуць рашацца важнейшыя пытанні вытворчасці.

Калі плануюць навукова-даследчую работу, улічваюць той факт, што ў даследчай рабоце актыўную ролю павінны прымаць студэнты. Дыпломныя работы, што выконваюць студэнты-хімікі, заўсёды з'яўляюцца невялікім навуковым даследаваннем, пры выкананні якога студэнты атрымаюць магчымасць набыць навыкі творчай работы. У гэтым годзе некалькі дыпломных работ будуць выконвацца на розных заводах Мінска па тэматыцы, падказанай патрэбамі прамысловасці.

В. СВІРЫДАЎ,
кандыдат хімічных навук.

Бадай што кожны з нас бачыць, як літаральна на вачах растуць сцены будучага галоўнага вучэбнага корпуса. Вось як ён будзе выглядаць у 1961 годзе.

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

★

10 сакавіка адбылася абарона кандыдацкай дысертацыі старшага выкладчыка кафедры рускай мовы нашага універсітэта І. А. Карабаня на тэму «Суфіксальнае ўтварэнне прыметнікаў са значэннем ступені якасці і эмацыянальнай ацэнкі». У дыскусіі прынялі удзел вядомыя вучоныя: доктар філалагічных навук прафесар А. Б. Шапіра, кандыдаты філалагічных навук М. І. Гурскі, Л. М. Шакун і іншыя.

Дысертацыя І. А. Карабаня мае вялікую навуковую цікавасць і з'яўляецца каштоўным укладам у славянскае мовазнаўства. У ёй багаты фактычны матэрыял на базе рускай і беларускай моў знайшоў правільнае тэарэтычнае абгрунтаванне. Асноўныя палажэнні гэтай навуковай работы могуць быць скарыстаны пры складанні слоўнікаў і апісальнай граматыкі.

Вучоны савет БДУ імя У. І. Леніна адзінадушна прысудзіў І. А. Карабаню вучоную ступень кандыдата філалагічных навук.

★

Па прадстаўленню камітэта камсамола універсітэта Мінскі гарадскі камітэт камсамола за выдатныя поспехі ў вучобе і актыўны ўдзел у грамадскай рабоце ўзнагародзіў «Пахвальнымі лістамі» студэнтак: Л. Паўловіч, Н. Голубеву, Р. Прохараву, Э. Шушкіну, Н. Слагаду, Т. Сіняк, Н. Песеньку, Г. Палешчукову, Л. Петрыенка, Н. Ляўданскую, С. Рудзяк, Н. Жучкову, В. Палуніну, С. Саўчук, В. Зайцаву, Л. Дук.

★

Камсамольская арганізацыя універсітэта для аказання дапамогі рабочым электратэхнічнага, аўтарамонтнага заводаў і завода запасных частак у падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў у ВНУ і павышэнні іх агульнаадукацыйнага ўзроўню накіравала 120 студэнтаў. Для работы ў піянерскіх арганізацыях Акцябрскага раёна г. Мінска паслана ад універсітэта 50 камсамольцаў.

★

Днямі будзе адкрыта фотавыстаўка «Студэнты БДУ імя У. І. Леніна на цалінных землях Казахстана». Выстаўка арганізавана камітэтам камсамола.

Баявыя задачы насценных газет

У вырашэнні адказнай задачы—усямернага паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў на аснове ўмацавання сувязі вучобы з вытворчасцю—ганаровая роля адводзіцца універсітэцкаму насценнаму друку.

У мінулым годзе ў некаторых факультэцкіх насценных газетах павярхоўна і бессістэмна асвятляліся пытанні вучобы і працоўнага выхавання студэнцтва. А, між іншым, гэта—галоўная тэма насценнага друку вышэйшай навучальнай установы. У кожным нумары насценнай газеты трэба шырэй асвятляць ход вучобы, папулярызаваць добры вопыт асобных студэнтаў і лепшых вучэбных груп, востра крытыкаваць праявы нядбайнасці ў вучобе, выпадкі парушэння дысцыпліны, дрэнных адносін да таварышаў, да калектыву.

Партыя і ўрад паставілі перад вышэйшай школай задачу арганізаваць вучэбны працэс такім чынам, каб у час вучобы студэнты былі непарыўна звязаны з прадпрыемствамі, сельскай гаспадаркай, набывалі вытворчыя навыкі, пэўныя веды канкрэтнай эканомікі.

Асвятляючы вучэбнае жыццё, трэба больш увагі ўдзяляць пытанням сувязі студэнтаў з вытворчасцю, якасці праходжання вучэбнай і вытворчай практыкі.

Вышэйшая школа прызвана не толькі даваць студэнцкай моладзі трывалыя веды па спецыяльнасці, але і няўхільна выхоўваць яе ў духу неўміручых ідэй марксізма-ленінізма, у духу камуністычнай свядомасці. Вялікая і адказная роля насценнага друку ў гэтай справе. Асвятляючы пытанні палітыка-выхаваўчай работы, кожная газета можа знайсці шмат прыкладаў для каштоўных і змястоўных артыкулаў, заметак і нарысаў.

Важная роля ў камуністычным выхаванні студэнтаў належыць камсамольскім арганізацыям. Належыць шырэй асвятляць на старонках насценных газет добры вопыт работы камсамольскіх арганізацый у гэтым кірунку, рэзка крытыкаваць недахопы.

У мінулым вучэбным годзе далёка не ўсе насценгазеты праявілі належную цікавасць да культуры і быту студэнтаў. На гэтыя вельмі адказныя тэмы ў іншых газетах з'яўляліся ад выпадку да выпадку павярхоўныя малазмястоўныя заметкі. А, між іншым, большая частка часу студэнтаў праходзіць за межамі аўдыторыі. Аб паводзінах у быце, у інтэрнатах, у грамадскіх месцах, аб адносінах да таварышаў, аб размеркаванні часу, арганізацыі самастойнай работы, аб культуры ўнутранай і знешняй—аб усім гэтым трэба пісаць больш, часцей, цікавей. Для насценгазет, якія выходзяць у інтэрнатах, гэтыя тэмы, зразумела, з'яўляюцца галоўнымі.

Аператыўна, з веданнем справы зможа асвятляць жыццё факультэта толькі тая газета, якая абапіраецца на шырокі аўтарскі актыў. Клопатам аб прыцягненні як мага больш аўтараў з ліку студэнтаў, выкладчыкаў, актывістаў грамадскай работы павінна быць прасякнута дзейнасць кожнага члена рэдкалегіі.

Рэдкалегіі насценных газет, выконваючы свой важны грамадскі абавязак, маюць права разлічваць на штодзённую дапамогу і ўвагу з боку партыйных і камсамольскіх бюро факультэтаў.



ЯШЧЭ РАЗ АБ ЗВАННЯХ І ВЕДАХ

НЯДАЎНА ў рэдакцыйнай пошце сярод іншых мы атрымалі такое пісьмо.

«Паважаная рэдакцыя!

Уважліва вывучаючы матэрыялы нечарговага XXI з'езда КПСС, я зацікавіўся тымі пытаннямі арганізацыі навукі, якія падняў у сваім выступленні таварыш Ц. С. Мальцаў. Асабліва мяне ўсхвалявала рэпліка Мікіты Сяргеевіча Хрушчова, сустрэтая бурнымі апладысментамі ўсяго з'езда: «А плаціць трэба не за званне, а за працу».

Я ўспомніў, што гады два назад у нашай газеце быў надрукаваны артыкул аб прынцыпова няправільнай сістэме аплаты працы навуковых работнікаў, прынятай у нашых навукова-даследчых і навучальных інстытутах.

Сутнасць артыкула была ў тым, што пры існуючай сістэме праца навуковых работнікаў, якія маюць вучонае званне, аплачваецца значна вышэй, чым такая ж праца маючага вышэйшую адукацыю, але не абароніўшага ў свой час дысертацыю. І нават калі гэты чалавек будзе працаваць лепш і больш, чым той, хто мае вучоную ступень, ён усё роўна будзе атрымліваць менш. Такім чынам, абароненая кандыдацкая або доктарская дысертацыя становіцца своеасаблівай рэнтай, што на працягу ўсяго жыцця прыносіць даход чалавеку, які дабіўся яе.

У мяне многа сяброў. Адны з іх працуюць у навукова-даследчых інстытутах, другія на прадпрыемствах. Мы часта сустракаемся, дзелімся планамі, гаворым пра будучае. І вельмі часта ў асяроддзі нашай навуковай моладзі прыходзіцца слухаць дрэнны афарызм:

«Вучоным можаш ты не быць, але кандыдатам быць абавязаны». Не, гэта не мілы жарт, а больш зло. Пад гэтымі словамі хаваюцца цынічныя, спажывецкія адносіны да навукі, не жаданне працай сваёй унесці ў яе ўклад, я цяга ўладкаваць жыццё за кошт навукі, ці больш дакладна—«кандыдацкай рэнты». З гэтай бытуючай у свядомасці некаторых маладых вучоных думкай трэба змагацца.

Я лічу, што газета павінна вярнуцца да пытання аб аплаце працы вучоных і дабіцца, каб яно было вырашана правільна. І ў навуцы павінен быць устаноўлены сацыялістычны прынцып аплаты па працы з улікам яго колькасці і якасці».

М. ШОРАХАЎ,
кандыдат тэхнічных навук,
Масква.

☆ ☆ ☆

АД РЭДАКЦЫІ: Мы звярнуліся да артыкула, аб якім успомніў у сваім пісьме таварыш Шорахаў. Артыкул гэты, падпісаны групай нашых вядомых вучоных,—акадэмікамі Д. Шчарбаковым і В. Энгельгардтам, членам-карэспандэнтам Акадэміі навук СССР І. Плаксіным, доктарамі тэхнічных навук Г. Бабатам і Г. Пакроўскім і пісьменнікам В. Балхавітінавым, быў надрукаваны не два, а тры гады назад—у сакавіку 1956 года.

Аўтары артыкула ўказвалі, што ў нашай краіне ўсюды ажыццяўляецца асноўны прынцып сацыялізма: ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго працы. Па колькасці і якасці працы аплачваецца работа сталявара і інжынера, трактарыста і рахункавода. Токар сёмага разраду зарабляе больш за токара трэцяга і чацвертага разраду не таму, што яму дзесьці быў прысвоены больш высокі разрад, а таму, што ён выконвае больш складаную работу... Пісьменніку не плацяць за тое, што ён з'яўляецца членам Саюза савецкіх пісьменнікаў, яму аплачваюць зробленую ім работу—кнігу, апавяданне, верш. Аднак у сістэме аплаты працы навуковых работнікаў чамусьці нярэдка парушаецца асноўны прынцып сацыялізма—роўная аплата за роўную працу.

Сапраўды, чым можна растлумачыць, што за адну і тую ж работу, напрыклад, за заведванне кафедрай, прафесар, доктар навук штомесячна атрымлівае прыкладна ў два разы больш, чым дацэнт, кандыдат навук, а інжынер (без вучонай ступені), якому даручана загадванне кафедрай, яшчэ менш? Напісаную калісьці навуковую работу, якая дала магчымасць атрымаць вучоную ступень, існуючая сістэма аплаты працы вучоных ператварае ў нейкае падабенства рэнты—пажыццёвы даход...

Далей у артыкуле ўказвалася, што гэтая сістэма прыводзіць да ўраўнілаўкі: аднолькавую зарплату атрымлівае і растучы навуковы работнік і той, які з году ў год чытае адзін і той жа канспект лекцый. Мэтай некаторых маладых людзей, што прыходзяць у навуку, становіцца не навуковая работа, а абарона дысертацыі, якая дае магчымасць атрымаць вучонае званне. Па гэтым прынцыпе «дысертабельнасці», а не важнасці, актуальнасці для навукі і вытворчасці выбіраюцца нярэдка тэмы кандыдацкіх дысертацый. Розніца ў аплаце працы навуковых работнікаў у інстытутах і вучоных, якія працуюць у прамысловасці, выдавецтвах і г. д., не садзейнічае прыходу на найбольш адказныя ўчасткі нашай народнай гаспадаркі людзей з вучоным званнем.

Чытачы актыўна адгукнуліся на надрукаваны ў нашай газеце артыкул. Рэдакцыя атрымала многа пісьмаў, прысвечаных закранутым праблемам. Пераважная большасць аўтараў гэтых пісьмаў падтрымлівала ўзнятае вучонымі пытанне. Частка пісьмаў была надрукавана на старонках газеты. Але сярод іх не было афіцыяльных адказаў ад тых арганізацый і інстанцый, якія павінны былі канкрэтна, па-дзелавому вырашыць гэтае пытанне.

Мінула тры гады—для краіны, якая імкліва развіваецца, тэрмін не малы. Многае змянілася. Узніклі і ўзмацнелі новыя формы ўпраўлення народнай гаспадаркай, выросла вытворчасць, краіна ўступіла ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Многае змянілася і ў навуцы. Стала абавязковай папярэдняя—перад абаронай—публікацыя матэрыялаў дысертацыі. Гэта дазваляе палепшыць кантроль грамадскасці за прысуджэннем вучоных званняў, устараніць «келейнасць» абароны дысертацыі. У аспірантуру ідуць ужо, як правіла, не выпускнікі, учарашнія студэнты, а людзі, якія папрацавалі некалькі гадоў на вытворчасці і знаёмыя з ёю. Бясспрэчна, сярод іх значна менш «паляўнічых за ступенямі» і больш людзей, па-сапраўднаму адданых навуцы. Сталі больш самастойнымі дысертацыі. Але не змянілася сістэма аплаты працы вучоных, якія працуюць ў навукова-даследчых і навучальных інстытутах. Паранейшаму «званне» застаецца падабенствам рэнты.

І больш мірыцца з гэтым, вядома, нельга. Нечарговы XXI з'езд КПСС паставіў перад усёй краінай велічныя па маштабах задачы развіцця прамысловасці, тэхнікі, сельскай гаспадаркі—усёй народнай гаспадаркі нашай краіны. У вырашэнні гэтых задач вялікая і роля савецкай навукі. І таму іменна зараз асабліва важна рашыць пытанне аб сістэме аплаты працы вучоных—кандыдатаў і дактараў навук, членаў-карэспандэнтаў і сапраўдных членаў акадэмій навук. Існуючая сістэма аплаты працы навуковым работнікам тармозіць развіццё нашай навукі. Яна не накіравана на заахвочванне пасапраўднаму працуючых вучоных, не стымулюе заняткаў навукай.

Бурнымі апладысментамі сустрэлі дэлегаты XXI з'езда рэпліку Мікіты Сяргеевіча Хрушчова: «А плаціць трэба не за званне, а за працу». І дарэчы папытаць, ці не пара выказаць сваю думку па гэтым пытанні Міністэрству вышэйшай адукацыі, прэзідыумам акадэмій навук, Дзяржплану?

(«Комсомольская правда»).



Галіна Валянцінаўна Гніліцкая набірае нашу газету. Але не думайце, што толькі таму змешчаны тут яе здымак. Галіна Валянцінаўна—вопытная лінатыпістка, яна працуе у друкарні выдавецтва БДУ звыш 5 год і заўсёды значна перавыконвае нормы.

Нозая спецыяльнасць

На матэматычным факультэце пачалася падрыхтоўка студэнтаў па новай спецыяльнасці: вылічальная матэматыка. Першы выпуск матэматыкаў-вылічальнікаў будзе ў 1960 годзе. Да падрыхтоўкі вылічальнікаў прыцягнуты буйнейшыя навуковыя сілы: прафесар В. І. Крылоў, доктар фізіка-матэматычных навук А. Е. Турэцкі, дацэнт І. В. Лебедзеў. Студэнты будуць праходзіць вялікую вылічальную практыку, а таксама вытворчую практыку ў вылічальным цэнтры.

М. МАРКІН.

АГЛЯД ДРУКУ

БОЛЬШ МАЙСТЭРСТВА

У КОРПУСЕ «Б» жывуць студэнты фізічнага і матэматычнага факультэтаў. Жывуць, трэба сказаць, у чысціні і ўтульнасці. Перш за ўсё, гэта заслуга саміх жа студэнтаў, але прыкметную ролю ў барацьбе за культурны быт займае і насценгазета. Назва ў яе шматзначная—«Метла». Насценгазета «Метла» з'яўляецца сатырычным органам студсавета корпуса «Б».

Днямі выйшаў чарговы нумар «Метлы». Перадавы артыкул яе прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню. Артыкул напісаны жыва, яскрава, без кніжна-газетных штампаў. У канцы перадавіцы зазначаецца, што **«очень многие девчата и нашего общежития достойно встречают этот праздник».** І далей пералічваюцца прозвішчы дзяўчат. Але якім чынам «достойно»: ці то поспехамі ў вучобе, ці ў грамадскай рабоце, так і невядома.

Далей ідуць карыкатуры і вершаваныя подпісы да іх, што, як заўсёды, складае асноўны змест «Метлы».

Галоўны недахоп карыкатур—адсутнасць у іх сатырычнай завостранасці, карыкатурнасці, цікавага вырашэння тэмы.

Як выключэнне—карыкатура на студэнта Сарокіна, які любіць іншы раз, што называецца, прылажыцца да чаркі. Сарокін намаляваны седзячым у бутэльцы з-пад гарэлкі, адну руку ён высунуў з яе. У руцэ—аркуш паперы, на якім напісана: **«Не вмешивайтесь в мои личные дела!»** Подпіс пад малюнкам тлумачыць, што Сарокін **«... с головою влез в бутылку и не желает вылезать».**

Большасць жа малюнкаў не адрозніваецца арыгінальнасцю і добрым тэхнічным выкананнем, хоць у мастака і маецца фантазія.

Частка карыкатур даецца ў вялікім плане, і некаторыя з іх—хутчэй малюнкі, чым карыкатуры. Напрыклад, «Метла» крытыкуе студэнтку Валю Крукоўскую за тое, што тая адказалася недзе там дзяжурыць—ці то ў вестыбюлі, ці то ў кухні—цяжка сказаць. Газета абураецца: **«Хоть грязи и мусора кухня полна, дежурить, дежурить, представьте, не хочет она».** Над подпісам—малюнак: вугал кухні, забруджаны да апошняй ступені. І ўсё. Рэдкалегія не здолела знайсці цікавы ход, каб малюнак (а патрэбна была б карыкатура!), подпіс да яго гучэлі востра, з добрай доляй сарказма.

Некалькі слоў пра подпісы да карыкатур. Зразумела, фізікі або матэматыкі—не дасканалыя паэты і ад іх нельга патрабаваць таго, што, напрыклад, ад філолагаў. Але стылістычныя недакладнасці нельга дараваць і ім.

Узяць да прыкладу такі подпіс:

Крысевич с каждым днём
растёт
В поступках героических:
Засорять водопровод
Он стал периодически.

Па-першае, слова «героических» трэба было ўзяць у двукоссе. Гэта не дробязь: ад таго, ёсць ці няма двукосся, слова можа мець розны сэнс. Па-другое, чаму «периодически»?! Ці не лепш было б сказаць «систематически»?

Нягледзячы на гэтыя большменш значныя недахопы, «Метла»—усё ж нядрэнная і цікавая сатырычная насценгазета, якая паспяхова спраўляецца са сваёй галоўнай задачай: вымятаць смецце з усіх куткоў дома, дзе адзінай сям'ёй жыве студэнцкая моладзь.

І. ПАТАПАЎ.

Упарадзе многа спраў

ПРАЙШОЎШАЯ СЕСІЯ паказала, што студэнты 3-га, 4-га і 5-га курсаў добрасумленна рыхтаваліся на працягу семестра і здалі экзамены на добра і выдатна. Аднак маюцца на курсах, асабліва на малодшых, і такія студэнты, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

У сучасны момант на курсах і ў групах праходзяць камсамольскія сходы з абмеркаваннямі вынікаў зімовай сесіі. 17 сакавіка адбыўся факультэцкі камсамольскі сход.

Вялікія задачы прадстаіць вырашыць камсамольцам матэматычнага факультэта ў другім семестры.

Камсамольскае бюро факультэта арганізуе ў другой палавіне сакавіка работу студэнтаў на будаўніцтве галоўнага корпуса універсітэта з тым, каб кожны студэнт адпрацаваў не менш 40 гадзін.

Пашыраюцца сувязі нашага факультэта з падшэфнымі арганізацыямі, прадпрыемствамі і воінскай часцю.

Ад нашага факультэта будуць працаваць, як і раней, у школах Мінска 14 студэнтаў піянерважатымі. Рабочым аўтамабільнага, аўтарамонтнага заводаў і завода запчастак камсамольцы факультэта акажуць дапамогу ў вучобе. У маі месяцы на факультэце будзе праведзены вечар сустрэчы студэнтаў з воінамі падшэфнай воінскай часці, дружба з якімі стала традыцыйнай. У канцы сакавіка маркуецца правесці вечар сустрэчы студэнтаў матэматычнага факультэта з былымі выпускнікамі фізмата БДУ імя У. І. Леніна. Вечар будзе праводзіцца сумесна з фізічным факультэтам.

Камсамольскае бюро намеціла рад мерапрыемстваў па паляпшэнню арганізацыйнай работы на курсах і ў групах і ажыўленню спартыўнай работы і мастацкай самадзейнасці.

Для студэнтаў факультэта ў красавіку будзе прачытана лекцыя аб сутнасці сучаснага рэвізіянізма.

Добрымі арганізатарамі зарэкамендавалі сябе члены факультэцкага бюро М. Неменман, С. Рудзяк, П. Манастырскі, сакратары камсамольскіх бюро 3 і 4 курсаў Н. Мароз, Н. Голубева і іншыя.

Нельга сказаць, што пастаноўка камсамольскай работы на факультэце не мае сваіх хібаў. У нас яшчэ ёсць многа камсамольцаў, якія не маюць грамадскіх даручэнняў. Есць і другія нявырашаныя пытанні. І вырашыць іх—наша тэрміновая задача.

М. ВАРЫН,
сакратар камсамольскага бюро матфака.

Спартыўная старонка Беларускага універсітэта

ВЕЛІЧНЫЯ ПЛАНЫ, намечаныя партыяй на XXI з'ездзе, ствараць усе ўмовы для таго, каб у бліжэйшы час савецкі народ стаў жыць яшчэ лепш, з больш поўным задавальненнем матэрыяльных і духоўных патрэб. Яшчэ больш шырокае развіццё атрымае фізічная культура, спорт і турызм.

У мінулым годзе ў круглагадовай спартакіядзе ўдзельнічала 2100 студэнтаў. Аналіз спаборніцтваў паказаў, што рад студэнтаў прымалі ўдзел нават у 3—4 відах праграмы спартакіяды, у той час як значная частка студэнтаў з'яўлялася толькі «балельшчыкамі» і ў спаборніцтвах удзелу не прымала. У гэтым годзе мы дазваляем студэнтам удзельнічаць не больш чым у 2-х відах праграмы спартакіяды. Гэта мерапрыемства прымусіла фізкультурны і камсамольскі актыў факультэтаў падумаць аб уцягненні вялікай колькасці сваіх студэнтаў у заняткі спортам, а не арыентавацца на невялікую групу спартсменаў высокіх разрадаў, якія маюць усебаковую спартыўную падрыхтоўку і могуць выступаць нават у 5-і відах праграмы спартакіяды.

Неабходна дабіцца такога становішча, каб кожны студэнт-старшакурснік лічыў сваім абавязкам удзельнічаць у спартыўных мерапрыемствах, якія праводзяцца на факультэтах.

З мэтай умацавання бюро фізкультуры факультэтаў неабходна ўвесці ў іх склад на правах намеснікаў старшынь бюро студэнтаў, адказных за пастаноўку фізкультурнай работы ад прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый. Такая перабудова работы дасць магчымасць факультэтам у адным плане ажыццяўляць кіраўніцтва фізкультурнай работай з удзелам усіх грамадскіх арганізацый.

Значным фактарам ва ўмацаванні здароў'я студэнтаў з'яўляецца ранішняя гігіенічная гімнастыка, якая на днях будзе ўведзена ва ўсіх інтэрнатах. Абавязак кожнага камсамольца аказаць усямерную дапамогу студкомам у арганізацыі гэтага важнага мерапрыемства. Мы ўпэўнены, што гэты добры пачатак атрымае поўную падтрымку сярод студэнтаў.

Рэарганізацыя фізкультурных органаў—гэта не проста замена аднаго кіруючага органа другім. Гэта карэнная перабудова ўсіх формаў і метадаў работы па пытаннях фізічнай культуры і спорту.

(З пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб кіраўніцтве фізічнай культурай і спортам у краіне»).

СПОРТ—ГЭТА ЦУДОЎНА

Аналіз вынікаў зімовай экзаменацыйнай сесіі паказаў, што на гістарычным, геаграфічным, філалагічным і хімічным факультэтах усе спартсмены здалі сесію паспяхова. Гордасцю нашага калектыву сталі спартсмены, здаўшыя сесію на «выдатна»: В. Воднеў (5 курс матфак) сталінскі стыпендыят; А. Антаневіч (1 курс матфака); Салдатаў (5 курс хімфака); Е. Нечай (3 курс фізфака); А. Гусакоў (4 курс фізфака); Верамейчык (2 курс філфака), член зборнай каманды рэспублікі па лёгкай атлетыцы; Л. Патаповіч (5 курс філфака), член зборнай каманды рэспублікі па гімнастыцы; Жданаў (4 курс юрфака); В. Павецьеў (3 курс юрфака); М. Напрэеў (5 курс гістфака); В. Лукашоў (3 курс геафака) і др.

Я. МАРКАЎ.
заг. кафедрай фізічнага выхавання і спорту.

ПЕРШЫЯ СУСТРЭЧЫ

Секцыя фехтавання—самая маладая спартыўная каманда ва універсітэце. Яна была створана у 1954 годзе і за 5 год дабілася добрых вынікаў. На яе ліку неаднаразовыя перамогі над моцным калектывам Палітэхнічнага інстытута. Пры сустрэчы з вопытнай камандай Вільнюскага універсітэта нашы фехтавальшчыкі прадэманстравалі добрую тэхніку валодання рапірай і штыком. І толькі няўпэўненасць у сваіх сілах асобных удзельнікаў дала магчымасць камандзе Вільнюскага універсітэта атрымаць перамогу з мінімальным лікам 8:7. Зараз каманда рыхтуецца да спаборніцтва з фехтавальшчыкамі Мінскага медыцынскага інстытута. У гэтым навучальным годзе склад каманды папоўніўся студэнтамі І-ых курсаў. На сістэматычных трэніроўках яны паспяхова авалодваюць правіламі і тэхнікай «боя».

Гордасць каманды складаюць першаразраднікі Р. Белякова і В. Паўловіч.

В. ХРЭНАЎ,
трэнер секцыі фехтавання.

НА ЗДЫМКУ: члены гімнастычнай секцыі адпачываюць у перапынках паміж заняткамі .

СПАРТЫЎНАЯ ХРОНІКА

ЛЫЖЫ

Лыжнікі універсітэта на рэспубліканскіх спаборніцтвах сярод ВНУ занялі 4-ае месца.

СПАРТЫЎНАЯ ГІМНАСТЫКА

У спаборніцтвах на першынства рэспублікі сярод ВНУ па гімнастыцы каманда універсітэта заняла 3-яе месца.

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

На гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы сярод ВНУ універсітэт заняў 2-ое месца.

ПЛАВАННЕ

У спаборніцтвах па плаванню на першынства ВНУ рэспублікі універсітэт заняў 3-яе месца.

КАНЬКІ

На гарадскіх спаборніцтвах сярод ВНУ па канькабежнаму спорту каманда універсітэта заняла 2-ое месца.

ШАХМАТЫ

На рэспубліканскіх спаборніцтвах па шахматах сярод ВНУ шахматысты універсітэта занялі 2-ое месца.

Старонку падрыхтавалі студэнты 2 курса аддзялення журналістыкі В. Куневіч і В. Вольскі.

Вялікай папулярнасцю сярод спартсменаў БДУ карыстаецца секцыя турызма-альпінізма. Шмат цікавых паходаў ажыццявілі яе ўдзельнікі.

НА ЗДЫМКУ: спартсмены-альпіністы пераадольваюць шчыліну ледавіка ў час паходу па Каўказе.

ПАЛАЖЭННЕ

аб правядзенні масавых спаборніцтваў на здачу норм ГПА

Мэты і задачы

Масавыя здачы норм на комплекс ГПА сярод студэнтаў 3—4—5 курсаў, прафесарска-выкладчыцкага складу і адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў універсітэта.

Месца і час правядзення

Спаборніцтвы праводзяцца ў залах і на спортпляцоўках універсітэта:

29 сакавіка—зала хімкорпуса
5 красавіка—лёгкаатлетычнае ядро
12 красавіка—лёгкаатлетычнае ядро

Кіраўніцтва спаборніцтвамі

Арганізацыя і правядзенне спаборніцтваў ажыццяўляюцца камітэтам камсамола універсітэта, мясцкомам, спортклубам і кафедрай фізічнага выхавання і спорту. Непасрэднае правядзенне спаборніцтваў ускладаецца на судзейскую калегію.

Праграма спаборніцтваў і тэрміны правядзення

ЖАНЧЫНЫ:

1. Падняцце і апусканне тулава на гімнастычнай лаве.
2. Штурханне ядра.
3. Кіданне гранаты.
4. Скачкі ў вышыню.
5. Скачкі ў даўжыню.

МУЖЧЫНЫ

1. Падцягванне на перакладзіне.
2. Штурханне ядра.
3. Кіданне гранаты.
4. Скачкі ў вышыню.
5. Скачкі ў даўжыню.

29 сакавіка (зала)

11-00—Падняцце і апусканне тулава на гімнастычнай лаве (жанчыны).
11-00—Падцягванне на перакладзіне (мужчыны).

5 красавіка

Спартыўная пляцоўка БДУ

12-00—Штурханне ядра (мужчыны і жанчыны).
12-00—Кіданне гранаты (мужчыны і жанчыны).

12 красавіка

Спартыўная пляцоўка БДУ

12-00—Скачкі ў вышыню (жанчыны).
12-00—Скачкі ў даўжыню (мужчыны).
13-30—Скачкі ў вышыню (мужчыны).
13-00—Скачкі ў даўжыню (жанчыны).

Мінімальны вынік, які ацэньваецца ў ачках

1. Падняцце і апусканне тулава на гімнастычнай лаве 15 разоў.
2. Падцягванне на перакладзіне—5 разоў.
3. Штурханне ядра (мужчыны)—6 метраў.
4. Кіданне гранаты (мужчыны)—27 метраў.
5. Скачкі ў вышыню (мужчыны)—115 сантыметраў.
6. Скачкі ў даўжыню (мужчыны)—360 сантыметраў.
7. Штурханне ядра (жанчыны)—5 метраў.
8. Кіданне гранаты (жанчыны)—15 метраў.
9. Скачкі ў вышыню (жанчыны)—95 сантыметраў.
10. Скачкі ў даўжыню (жанчыны)—3 метры.

УЗНАГАРОДЫ

Удзельнікі, заняўшыя з 1 па 3 месца па любому віду праграмы, узнагароджваюцца дыпломамі адпавядаючых ступеняў. Удзельнікі, заняўшыя з 1 па 5 месца ў суме шматбор'я, узнагароджваюцца прызамі і граматамі рэктарата.

МЯСЦКОМ БДУ,
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА,
СПОРТКЛУБ,
КАФЕДРА ФІЗВЫХАВАННЯ.

НА ЗДЫМКУ: студэнты 1-га курса філалагічнага факультэта перад пачаткам заняткаў па лыжнаму спорту.

Вялікі вынаходца радыё

ЁСЦЬ ДАТЫ, якія, як маякі, асвятляюць чалавецтву гістарычныя шляхі і рубяжы. Такой знамянальнай датай з'яўляецца, несумненна, 100 год з дня нараджэння вялікага вучонага, вынаходцы радыё Аляксандра Сцяпанавіча Папова. У цяперашні час няма ні аднаго боку чалавечай дзейнасці, якую ў той ці іншай меры не закранала б радыёэлектроніка. Пералічыць дасягненні сучаснай радыёэлектронікі—гэта значыць пералічыць дасягненні нашай навукі, культуры, тэхнікі, прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту. Нарэшце, выпуск савецкіх штучных спадарожнікаў Зямлі і міжзоркавы палёт савецкай касмічнай ракеты—гэта буйнейшае навукова-даследчае дасягненне стала магчымым таксама ў значнай меры дзякуючы прымяненню даволі дакладнай, лёгкай і надзейна працуючай ва ўмовах касмічнага палёту аўтаматычнай радыёэлектроннай апаратуры. Новыя адкрыцці ўсё больш і больш расшыраюць вобласць прымянення гэтай надзвычайнай вобласці навукі і тэхнікі. Будучае радыё яшчэ ўперадзе. А. С. Папоў лепш, чым хто-небудзь другі разумеў, якое значэнне мае зробленае ім вынаходніцтва. Свайму сябру і памочніку П. М. Рыбкіну, вынаходцу радыётэлеграфа, сказаў: «Петр Мікалаевіч, мы зрабілі адкрыццё, усё значэнне якога зараз наўрад ці хто адразу зразумее». Дзень 7 мая 1895 года, калі А. С. Папоў зрабіў першае паведамленне аб вынаходніцтве радыё, увайшоў у гісторыю навукі і тэхнікі як дзень нараджэння радыё.

Як вучоны, А. С. Папоў валодаў перш за ўсё дарам шырокага і смелага абагульнення, валодаў здольнасцю бачыць галоўнае. Увасабляючы ў жыццё ідэю, якая шмат якім здавалася неажыццявімай, А. С. Папоў праявіў вострае тэхнічнае чуццё і глыбокае разуменне сутнасці з'явы, ажыццявіў тое, што з'яўляецца адным з лепшых дасягненняў сучаснай цывілізацыі. А. С. Папоў дарагі нам не толькі як выдатны вучоны і вынаходца. Ён нам удвая дарагі сваімі адносінамі да грамадскага абавязку, сваім усведамленнем высокага абавязку служэння Радзіме. На прапановы замежных капіталістаў прадаць сваё вынаходніцтва альбо пераехаць за граніцу А. С. Папоў адказаў :«Я—рускі чалавек і ўсе свае веды, усю сваю працу, усе свае дасягненні буду аддаваць толькі маёй Радзіме». А. С. Папоў можа служыць прыкладам вучонага-патрыёта ў самым прамым і высокім сэнсе гэтага слова.

М. Я. РЭЗНІКАЎ,
кандыдат фізіка-матэматычных навук.

УНІВЕРСІТЭТЫ СВЕТУ

ПЕКІНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

У ЗАХОДНІМ раёне Пекіна размешчаны карпусы Пекінскага універсітэта, а ў раёне Заходніх гор, каля Летняга палацу, растуць новыя будынкі універсітэта.

Пекінскі універсітэт мае слаўную рэвалюцыйную гісторыю. Ён быў заснаваны ў 1898 годзе. У маі мінулага года адзначалася яго 60-годдзе. Ужо да пачатку дэмакратычнага руху «5 мая» перадавыя колы універсітэта вялі барацьбу супроць ідэалогіі феадалізма. З пачатку руху Пекінскі універсітэт на працягу ўсяго часу адыгрываў вялікую ролю ў вызваленчай барацьбе кітайскага народа за сваю незалежнасць супроць замежных імперыялістаў. Тут працаваў вялікі правадыр кітайскага народа Мао Цзэ-дун, першы кітайскі марксіст Лю Дао-чжао, відныя дзеячы новай кітайскай культуры. Іх рэвалюцыйная дзейнасць цесна звязана з Пекінскім універсітэтам.

Пасля вызвалення краіны ад улады гамінданаўцаў пачалася рэарганізацыя навучальных устаноў. Тады быў створаны новы Пекінскі універсітэт на базе трох універсітэтаў: Чын хуа Ян Цзынь і старога Пекінскага. Для студэнтаў былі пабудаваны новыя інтэрнаты. Цяпер кожныя 4 студэнты маюць асобны пакой з усімі выгодамі.

Раней ва універсітэце было 6.135 студэнтаў і 834 выкладчыкі. Цяпер іх лік узрос у 2—3 разы. Павялічыўся лік студэнтаў з рабочых і сялян.

Разам з кітайскімі таварышамі тут жывуць і вучацца 200 студэнтаў з 14 розных дзяржаў, у тым ліку з СССР, краін народнай дэмакратыі, Індыі, Інданезіі.

За апошнія 5 гадоў універсітэт непазнавальна змяніўся, атрымаў новае абсталяванне, у тым ліку вельмі добры рэнтгенаўскі кабінет. Універсітэцкая бібліятэка налічвае 1 мільён 800 тысяч тамоў, уступаючы толькі Пекінскай бібліятэцы—самаму буйнейшаму кнігасховішчу Кітая.

Сярод выкладчыкаў многа вядомых вучоных, прафесараў, пісьменнікаў: фізік Чжоу Пэй-юань, матэматык Сю Бао-лу, заолаг Чэн Чжэнь, гісторык Дзен Бо-цзань, філосаф Тан-Юн-дань, пісьменнік і паэт Фын Чжы, вядомы перакладчык Цао Дзін-хуа, рэктар універсітэта—відны эканаміст Ма Ін-чу. Мацнеюць міжнародныя сувязі кітайскіх вучоных. Дэкан факультэта рускай мовы і літаратуры прафесар Цао Дзін-хуа ездзіў у Маскву на юбілей Дастаеўскага і наведаў Маскоўскі універсітэт. Прафесар Дзян Боцзан удзельнічаў у пасяджэнні кітаяведаў Заходняй Еўропы. Дэкан усходняга факультэта прафесар Дзі Сян-мін прыняў удзел у Лейпцыгскім пасяджанні вучоных-лінгвістаў.

Ва універсітэце працуюць 14 савецкіх спецыялістаў. Яны дзеляцца сваім багатым вопытам, займаюцца навукова-даследчай работай, аказваюць універсітэту вялікую дапамогу.

Ва універсітэце 13 факультэтаў. На кожным з іх вядзецца вялікая навукова-даследчая работа. 7 мая мінулага года, у гадавіну заснавання універсітэта, адбылася навуковая канферэнцыя, на якой было абмеркавана больш чым 100 работ. Сёлета запланаваны даследаванні па 478 тэмах, з якіх 234 па прыродазнаўчых навуках.

Чытанне лекцый цесна звязана з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Зараз, напрыклад, вывучаюцца такія пытанні, як праблемы калектывізацыі сельскай гаспадаркі, перыядызацыі сучаснай кітайскай гісторыі, устанаўленне адзіных нормаў вымаўлення ў кітайскай мове.

Навуковыя даследаванні сталі праводзіцца больш інтэнсіўна пасля таго, як Камуністычная партыя Кітая паставіла задачу за 12 гадоў падняць кітайскую навуку да ўзроўню сусветнай навукі. Вывучэнне марксізма-ленінізма дапамагае выкладчыкам у іх навуковай і педагагічнай рабоце.

Ва універсітэце вучыцца бадзёрая, жыццерадасная моладзь. Яна ведае, як патрэбны краіне добрыя спецыялісты. Вечарамі студэнты запаўняюць кабінеты, чытальні, бібліятэкі, дзе растуць і мацнеюць іх крыллі, тут яны рыхтуюцца ўзляцець высока ў неба Радзімы. Вучэнне—гэта настойлівая і цяжкая праца, але кітайскія студэнты не баяцца цяжкасцяў.

Ва універсітэце існуе нямала навуковых гурткоў, працуе аб'яднанае студэнцкае навуковае таварыства. Студэнты астранамічнага аддзялення абсталявалі пляцоўку для назірання за нябеснымі свяцілами. Студэнты-біёлагі арганізавалі брыгаду ў дапамогу бібліятэкам сельскагаспадарчых кааператываў. Навуковы гурток хімічнага факультэта дапамог рамесным кааператывам, што заняты вырабамі з фарфору, вырашыць шэраг тэхналагічных праблем.

Амаль усе студэнты універсітэта займаюцца ў спартыўных секцыях і шматлікіх гуртках мастацкай самадзейнасці.



ЛЕНІНГРАД. У электратэхнічным інстытуце імя У. І. Ульянава (Леніна) ў былым рабочым кабінеце прафесара фізікі А. С. Папова вось ужо 11 год адкрыты музей, прысвечаны вялікаму рускаму вучонаму, вынаходцу радыё. Тут сабраны шматлікія дакументы, розныя прыборы, партрэты, асабістыя рэчы Папова. Музеем загадвае дачка вучонага—Кацярына Аляксандраўна Папова—К'яндская .

НА ЗДЫМКУ: правобраз сучаснага дэтэктарнага прыёмніка—тэлефонны радыёпрыёмнік сістэмы А. С. Папова, пабудаваны фірмай Дзюкрэтэ, за які А. С. Папоў атрымаў залаты медаль на Сусветнай выстаўцы ў Парыжы ў 1900 годзе.

Фота В. ФЕДАСЕЕВА.
Фотахроніка ТАСС.

ІХ НОРАВЫ

„ПАМЫЛІЛІСЯ"

Газета «Дэйлі ньюс» паведаміла: «Памылка ў нацыянальнасці каштавала кубінцу жыцця». Так лёгка былі вытлумачаны прычыны зверскай расправы, якую група расістаў учыніла над беспрацоўным юнаком.

Справа была так. З вострава Куба ў Нью-Йорк прыехаў Джуліо Рамо—шукаць работу. На другім тыдні пасля прыезду малады кубінец са сваёй сяброўкай Эміліяй Рывера сядзеў на лаўцы ў адным з гарадскіх паркаў. Яго смуглявая скура прыцягнула ўвагу шасцярых «чыстакроўных» белых амерыканскіх хлопцаў.

— Пуэртарыканец?! Правучым яго!—З гэтымі крыкамі «чыстакроўныя» накінуліся на кубінца і сталі яго біць. У ход пайшлі цяжкія палкі, вялікая бутэлька. драцяны кошык для смецця. А калі Рамо страціў прытомнасць і ўпаў, варвары пачалі таптаць яго нагамі.

На наступны дзень Джуліо Рамо памёр. Памёр «з прычыны памылкі»,—так заключыла «Дэйлі ньюс». Хлопцы ж не ведалі, што ён кубінец, палічылі яго за пуэртарыканца. А людзям з каляровай скурай у гэтым месцы парку з'яўляцца не дазволена. Дарэчы, пра самы парк: ён носіць імя амерыканскага асветніка Томаса Джэферсона, якому належаць словы: «Усе людзі нараджаюцца роўнымі»!

КАГО БОЛЬШ ЛЮБЯЦЬ БЛОХІ

Адзін з прафесараў Нью-Йоркскага універсітэта містэр Эдман Бента працуе зараз над вельмі «важнай навуковай праблемай»: каго больш любяць блохі—мужчын ці жанчын, і па якіх прычынах яны выбіраюць тую ці іншую ахвяру.

Кіраўніцтва універсітэта, ідучы насустрач гэтаму «вучонаму мужу», выдзеліла яму спецыяльную стыпендыю, якая дае яму магчымасць працаваць над гэтай «вялікай навуковай праблемай» на працягу трох гадоў.

«ТУРЭМНЫЯ ЭКСКУРСІІ

Гарадскія ўлады Агыкі (штат Нью-Йорк, ЗША) рашылі праводзіць для ўсіх школьнікаў рэгулярныя экскурсіі па мясцовых турмах. Мэтай гэтага «педагагічнага» мерапрыемства—знізіць катастрафічна ўзросшае дзіцячае злачынства. Аднак некаторыя чыноўнікі выказваюць апасенне, што вынік можа атрымацца зусім адваротны: дзеці проста прывыкнуць да турэмных абставін.

Павучальныя лічбы і факты аб алкагалізме

Людзі, якія маюць схільнасць да спіртных напіткаў (алкаголікі), былі яшчэ да нашай эры. У той час п'яніца лічыўся самым пікчэмным чалавекам.

У 1220 годзе да нашай эры кітайскі імператар Ву-Вонг выдаў закон, па якім **каралі смерцю ўсіх асоб, захопленых у час папойкі.**

У Англіі існаваў у той час **звычай надзяваць на алкаголікаў ярмо, а потым вадзіць іх па галоўных вуліцах горада.**

У Галандыі асабліва пагардліва адносіліся да п'яных жанчын. Іх прывязвалі рэмнямі да сядзенняў, умацаваных на блоку, і **тры разы апускалі ў ваду.**

Але вельмі хутка **эксплуататарскія класы зразумелі, што спіртныя напіткі—іх саюзнік у закабаленні працоўнага народу.** Пачалася не барацьба з п'янствам, а яго падтрымка. Пры цары Аляксею Міхайлавічу чалавека, які перашкаджаў п'янству, лічылі «дзяржаўным злодзеем» (г. з. злачынцам). Калі, напрыклад, жонка выцягвала з карчмы мужа, прапіваўшага апошнюю кашулю, то стражнікі мелі права **«пытать оную и бить нещадно батогами, аки государственного вора».**

Асабліва хутка пачынае распаўсюджвацца п'янства з прыходам да улады буржуазіі. Цяжкія ўмовы працы, беспрасветнае жыццё прымушалі рабочага ісці ў карчму. А карчомкі раслі з хуткасцю ланцуговай рэакцыі.

«Усе спакусы, усе магчымыя спакушэнні злучаюцца для таго, каб уцягнуць рабочага ў п'янства. Спіртныя напіткі з'яўляюцца для яго амаль адзінай крыніцай радасці, і ўсе як бы штурхаюць яго да гэтай крыніцы»,—пісаў Ф. Энгельс у сваёй працы «Становішча рабочага класа ў Англіі». І далей ён робіць вывад:

«П'янства перастала тут быць заганай, за якую можна асуджаць таго, хто ім заражоны; яно становіцца неабходнай з'явай, непазбежным вынікам вызначаных умоў, якія дзейнічаюць на аб'ект. Няхай за гэта нясуць адказнасць тыя, хто ператварыў рабочага ў такі аб'ект».

Сацыялістычны лад выбіў глебу для алкагалізма. Свабодны савецкі чалавек, гаспадар сваёй краіны, павінен быць далёкі ад схільнасці да п'янства. У Савецкім Саюзе рэзка скарацілася ўжыванне алкаголю ў параўнанні з царскай Расіяй і капіталістычнымі краінамі.

Вось лічбы ўжывання алкаголю ў разліку на аднаго чалавека ў лічбах чыстага спірту, прыведзеныя тав. Мікаянам у адным з выступленняў (у год):

Францыя—18,9 л.
Бельгія —11,2 л.
Англія—3,2 л.
СССР—1,6 л.

Гэтыя лічбы, здавалася б, нядрэнныя для нашай краіны, не даюць нам права заспакайвацца.

П'янства—перажытак мінулага, і яго трэба выкараняць да канца. Кожны павінен памятаць, што **каля 80 працэнтаў усіх злачынстваў учыняецца ў нецвярозым стане. На п'янстве ляжыць віна за грабяжы, насільлі і забойствы, за шматлікія сямейныя драмы.**

Але асноўная бяда спіртных напіткаў у тым, што яны згубна дзейнічаюць на чалавечы арганізм. Захворванне алкаголікаў у некалькі разоў большае, чым нармальных людзей.

Памятай: гарэлка—твой вораг, вораг тваёй сям'і, вораг нашага грамадства!

Чатыры якасці

Адзін мудрэц сказаў:

— Віно надае кожнаму, хто п'е яго, чатыры якасці.

Спачатку чалавек становіцца падобным да паўліна—ён надзімаецца, яго рухі плаўныя і велічныя.

Потым ён набывае характар малпы і пачынае з усімі жартаваць і заігрываць.

Потым ён прыпадабняецца ільву і становіцца саманадзейным, гордым, упэўненым у сваёй сіле.

Але ў заключэнне ён ператвараецца ў свінню і, падобна ёй, валяецца ў гразі.

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19.

АТ 03 100 **Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна.** Зак. 326.